# У БІБЛІЯТЭКУ НЕ ТОЛЬКІ ЗА КНІГАЙ

**Людміла Мінкевіч**
*mila@sb.by*

Заўтра ў краіне адзначаецца Дзень бібліятэк. Быў час, калі здавалася, што вось-вось бібліятэкі сваё аджывуць, іх загубіць інтэрнэт. Але сёння мы бачым, што разам з інфармацыйнымі тэхналогіямі развіваецца і бібліятэчная сістэма. Больш за тое, гэтыя самыя тэхналогіі рухаюць кніжныя захавальніцы наперад.

— Сёння за мяжой не ўзнікае пытання: бібліятэкі — рудымент ці сучасныя інфармацыйныя цэнтры? Бібліятэкі сталі важнай часткай інфраструктуры інфармацыйнага грамадства, — разважае старшыня савета Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі Іна Юрык. — Магчыма, у нас сітуацыя развіваецца крыху павольней. Але крокі робяцца. І яны маюць свае вынікі. Мы стараемся адсочваць сусветны вопыт. Бачым, што за мяжой сябе апраўдалі дастаткова шмат мадэляў бібліятэк. Да прыкладу, такія як гібрыдная бібліятэка, якая дае доступ не толькі да кніжнага фонда, але і да электронных рэсурсаў, бібліятэка як прастора, бібліятэка як трэцяе месца.

Новыя фарматы працы выкарыстоўваюць і нашы бібліятэкі. Асобныя ўстановы могуць пахваліцца віртуальнымі чытальнымі заламі, маштабнымі выдавецкімі праектамі, правядзеннем кніжных фестываляў, “Бібліяночы”, іншых акцый.

— На бібліятэкі сёння ўскладаюцца задачы не толькі па захаванні і трансляцыі нацыянальнай і сусветнай культурнай спадчыны, але адначасова і спрыянні ўстойліваму развіццю сучаснага інфармацыйнага грамадства, — лічыць галоўны спецыяліст упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Сяргей Бацян. — Інфарматызацыя бібліятэк сёння з’яўляецца адным з галоўных кірункаў працы. Прысутнасць бібліятэк у інтэрнэт-прасторы няспынна пашыраецца. Але яшчэ ёсць шэраг праблем. Па краіне камп’ютарызавана каля 85 працэнтаў публічных бібліятэк, да сеткі інтэрнэт падключана 75 працэнтаў устаноў. Будзем спадзявацца, да канца года гэтыя лічбы зменяцца.

Першы намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алена Далгаполава ўпэўнена, што ёсць і шэраг іншых момантаў у бібліятэчнай сістэме краіны, якія патрабуюць удасканалення:

— Нам патрэбна працягваць перабудову сеткі, але за кошт не толькі скарачэння колькасці бібліятэк, але і развіцця сістэмы бібліябусаў. За мяжой такія машыны абсталяваны кампю’тарамі, забяспечаны доступам у інтэрнэт, кафортнымі працоўнымі месцамі. У нас у краіне, на жаль, няма ніводнага бібліябуса такога ўзроўню. Магчыма, патрэбна змяненне фінансавання бібліятэк. Напэўна, трэба пераглядаць і функцыі бібліятэк. Але ўсе гэтыя пытанні бібліятэкары не могуць вырашыць самастойна. Павінны быць сумесныя рашэнні дзяржавы, грамадства і прафесіяналаў.

## Бібліятэчная сістэма краіны на пачатак года



Агульная колькасць бібліятэк — **7200**

Сукупны фонд бібліятэк — каля **180 мільёнаў** адзінак захоўвання

**У структуры Міністэрства культуры:**

Колькасць публічных бібліятэк, у тым ліку Нацыянальная бібліятэка, — **2583**

Бібліятэкі ў сельскай мясцовасці — **2024** (78% ад агульнай колькасці)

Штат бібліятэчных работнікаў — **10 379** чалавек

Агульная колькасць наведванняў бібліятэк у 2017 годзе — больш за **29 мільёнаў**, у тым ліку віртуальных — **4,4 мільёна**

Прырост чытачоў за мінулы год — **4%**